ТЭЛЕПРАГРАМА НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ – на 3-й старонцы

Свабода, роўнасць, братэрства!



Беларускі Усход

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

● Заснавана ў 1991 годзе ● № 6 (87) ● Чацвер, 10 лютага 2000 г. ● У розніцу кошт свабодны

Аб'явы

Лячэнне біяэнергіяй. Звяртацца па адрасе: 213692, Магілёўская вобл, Хоцімскі р-н, в. Ветка, Тофелеў Вячаслаў Міхайлавіч.

* * *

Калі ў вас ёсць вольны час і вы жадаеце крыху падзарабіць — рэдакцыя газеты "Беларускі Усход" прапануе вам стаць прадаўцом газеты ў розніцу. Аплата працы —дагаворная. З даведкамі звяртацца па тэлефоне: у Хоцімску 22-9-89.

Клуб знаёмстваў

Абанент N8. *Мужчина, для которого семья и дети в жизни — главное, пусть напишет. Мне 30 лет, разведена. Две дочери — 8 и 2 года. Младшая — приёмная. Адрес в редакции.*



Белы дзень. **Фота Валерыя БЫСАВА.**

Аб'ява

Рэдакцыя газеты "Беларускі Усход" прымае заказы на размяшчэнне рэкламы, аб'яў і іншай інфармацыі па самых нізкіх у Беларусі расцэнках:

Аб'вы фізічных асоб.

1. Па купонах, выразаных з газеты — бясплатна, любы тэкст (але не больш 1 купона ад 1 асобы).
2. Аб пошуках работы — бясплатна.
3. Аб страце дакументаў — 100 рублёў.
4. Іншыя (ў залежнасці ад займаемай газетнай плошчы):
— да 5 кв. сантыметраў — 200 рублёў;
— да 7,5 кв. — 300 рублёў;
— да 10 кв. — 400 рублёў;
— да 12,5 кв. — 500 рублёў;
— аб знаёмстве з указаннем адваротнага адрасу — 200 рублёў.;
— аб знаёмстве без указання адваротнага адрасу — 220 рублёў.
5. Віншаванне, удзячнасць, спачуванне — 200 рублёў.

Для юрыдычных асоб.

1. Рэклама па прадстаўленаму тэксту (рублёў за 1 кв. сантыметр газетнай плошчы);
— на першай старонцы — 60 рублёў;
— на ўнутраных старонках — 40 рублёў;
— на апошняй старонцы — 50 рублёў.
Рэклама ў выглядзе разгорнутых журналісцкіх матэрыялаў — 30% ад указаных расцэнак.
2. Аб'явы — за 1 кв. сантыметр газетнай плошчы — 60 рублёў.
3. Спачуванне, віншаванне, удзячнасць — 250 рублёў.

Скідкі для заказчыкаў:
— за паўтарэнне заказа ў наступным нумары — 20%;
— за паўтарэнне ў трэці раз — 50%.

Аплата паслуг рэкламных агентаў і агенцтваў (ад кошту арганізаванай паслугі):
— разавая паслуга — 15%;
— сталае супрацоўніцтва з прадастаўленнем арыгіналмакета —20%;
— аплата заказаў — папярэдняя.

За даведкамі звяртацца па тэлефоне у Хоцімску 22-9-89.

НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ

НОВЫЯ ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ

З 20 студзеня павялічаны закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Цяпер тона малака без уліку падатку на дабаўленую вартасць складае: вышэйшы гатунак 63300 новых рублёў, першы гатунак — 46800 і другі гатунак — 37300 рублёў.

Буйная рагатая жывёла ў жывой вазе: вышэйшая укормленасць — 283900 рублёў за тону, сярэдняя — 191700.

Свініна: І-й катэгорыі — 450000 рублёў за тону, ІІ-й — 425500, ІІІ-й — 404200 і ІV-й — 315000 рублёў.

А па якому кошту гэтая прадукцыя прадаецца людзям?

Прыкінце, гараджане, як дзяржава абкрадвае і вас, пакупнікоў, і вяскоўцаў, што гадуюць жывёлу. Возьмем, да прыкладу, свініну. За кілаграм І-й катэгорыі вяскоўцу плацяць 450 рублёў. А прадаюць у магазіне? Больш як у тры разы даражэй!

Задушылі селяніна, задушылі... Ды і гараджанам не вельмі па кішэні мяса ды малако. Пра добрую каўбасу ужо і гаварыць не прыходзіцца.

Ці скончацца калі-небудзь такія здзекі над народам?

Наш кар.

БЕЛАРУСЬ МАЕ МАГЧЫМАСЦЬ ВЫРАБІЦЬ БІЯЛАГІЧНУЮ ЗБРОЮ

Амерыканская газета "Вашынгтон Таймс" назвала Беларусь сярод 12 краін свету, якія маюць тэхнічную магчымасць вырабіць біялагічную зброю. У гэты спіс трапілі таксама яшчэ тры краіны былога СССР — Расія, Украіна і Казахстан. З іншых краін — Індыя, Ірак, Іран, Кітай, Лівія, Пакістан, Паўночная Карэя і Сірыя. Як піша газета, на думку амерыканскіх спецыялістаў, асноўная небяспека ў дачыненні да краін былога СССР, перш за ўсё, Расіі, у тым, што некаторыя з былых удзельнікаў сакрэтных праграм, якія сёння засталіся без працы, могуць прапанаваць свае паслугі кожнаму, хто паабяцае вялікія грошы.

БелПАН.

САМАЙ СТАРЭЙШАЙ ЖЫХАРЦЫ БЕЛАРУСІ — 122 ГАДЫ!

У вёсцы Ніжнія Жары Брагінскага раёна Гомельскай вобласці жыве Марыя Васільеўна Шарая, якой споўнілася 122 гады! Гэта самая старэйшая сёння жыхарка Беларусі.

Яна зведала працу вольную на сваёй зямлі і нявольную — у калгасе.

— Аднаасобна было лепш жыць, лягчэй, —гаворыць Марыя Васільеўна, — і заможней. У калгасе — праца прымусовая і плата за працу жабрацкая.

Кузьма ШУЛЬЦ.

БАНКІРА БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ

Следчым аддзелам упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Пракуратуры РБ завершана следства і крымінальная справа накіравана ў суд па абвінавачванню бухгалтара Маладзечанскага філіяла АСБ "Беларусбанк". Яна абвінавачваецца ў тым, што на працягу 1997-1999 гадоў выкрала 4,8 млрд. рублёў і больш як 3 тысячы долараў ЗША.

Аляксей ТАРАНА[illegible]

ВУЧНІ-РАЗБОЙНІКІ

Раніцай а шостай гадзіне ў Ба[illegible] ранавічах таксіст, на сваю бяд[illegible] падхапіў бяскрыўдных на выгля[illegible] маладых пасажыраў. Уся тройц[illegible] — вучні 9-х класаў.

Аднак моладзь паказала муж[illegible] чыну зубы. Пагражаючы нажо[illegible] хлопцы звязалі таксіста, закіну[illegible] ў салон, забралі 7 мільёнаў не[illegible] дэмінаваных рублёў і "на кола[illegible] накіраваліся прэч з горада.

На шчасце, прыгоды таксіст[illegible] скончыліся паблізу вёскі Іванав[illegible] Нясвіжскага раёна, дзе машын[illegible] а палове дванаццатай дня спы[illegible] нілі работнікі ДАІ.

Ігар ГРЫШЫ[illegible]

СМЕРЦЬ АД ГАРЭЛКІ

Неразборлівасць прывяла д[illegible] трагедыі і каштавала жыцця муж[illegible] і жонцы з пасёлка Брузгі, што [illegible] Гродзенскім раёне.

Раніца ў доме сям'і пачалася [illegible] недамагання як мужчыны, так [illegible] жанчыны. 56-гадовая жонка, яко[illegible] раптам стала кепска, адразу [illegible] памерла. А яе мужа ўрачы пас[illegible] пелі давезці да бальніцы, дзе ё[illegible] таксама неўзабаве памёр. Я[illegible] было ўстаноўлена пазней, пры[illegible] чынай іх смерці стала атручэнн[illegible] сурагатамі алкаголю.

Ігар ГРЫШЫ[illegible]

ЦВЯРОЗЫ КАЛГАС

Арыгінальны спосаб барацьб[illegible] з п'янствам прымяняе кіраўніц[illegible] ва аднаго з калгасаў Бялыніцка[illegible] га раёна. Праўленне калгаса пра[illegible] панавала двум дзесяткам заяд[illegible] лых выпівох заключыць кантрак[illegible] на аплату з калгаснай касы іх кадзіравання ад алкагалізму.

Па умовах кантракту, калі кагосьці з калгаснікаў зноў абвінавацяць у п'янстве, алкашу прыдзецца пакрыць усе расходы на сваё лячэнне ў 10-кратным памеры.

СТВАРАЕЦЦА "УРАД У ВЫГНАННІ"

Апазіцыя на чале са старшынёй Вярхоўнага Савета 13-га скліканя Сямёнам Шарэцкім, які з лета 1999 год жыве у Вільнюсе, распачала фарміраванне "Урада рэспублікі ў выгнанні".

"Юрыдычна нікчэмныміˮ назваў гэтыя дзеянні намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў пасля нядаўняй сустрэчы ў Вільнюсе са сваім літоўскім калегам Вігаўдасам Ушацкісам.

Выступаючы перад журналістамі, Ушацкас адзначыў неабходнасць аднаўлення дыялога паміж беларускімі ўладамі і апазіцыяй.

Барыс ПАРФЕНЦЬЕЎ.

ЗА ЦВІКАМІ — У КАРАНЕЦ

У Крычаўскі РАУС звярнуўся жыхар вёскі Каранец з заявай аб кражы ў яго цвікоў. Іх было украдзена два пуды прама з хаты ноччу. Прынятымі міліцэйскімі мерамі было ўстаноўлена, што кражу здзейсніў Пятрок, які жыве ў вёсцы Міхеевічы.

КУРАКРАД З КРАСНАПОЛЛЯ

Зараз такі час, што ў Крычаўскім раёне сваіх злодзеяў хоць адбаўляй, а тут яшчэ і залётныя гастралёры садзейнічаюць росту злачыннасці. Вось і нядаўна раней судзімы жыхар Краснаполля Пётр, зламаўшы замок, залез у куратнік да аднаго з жыхароў Крычава па вуліцы Гастэла і ўкраў дзевяць курэй, ды яшчэ і кансерванты прыхапіў.

ЗВЯЛІ БЫЧКА

У Крычаўскі РАУС патэлефанаваў старшыня калгаса "Зорка", што з адкормачнага комплекса знік бычок вагой 120 кілаграмаў. На пытанне, хто звёў жывёліну з комплекса, хутка знайшоў адказ участковы інспектар А.Язерскі. Кражу ажыццявілі нідзе непрацуючыя жыхары Крычава Сяргей і Андрэй. Па факту ўзбуджана крымінальная справа.

Аляксандр БАЛДОЎСКІ

ШКОЛЬНІК-РАБАЎНІК

Калі прадавец аднаго з камерцыйных магазінаў у Віцебску была адна, на жанчыну напаў невядомы ў масцы. Пагражаючы нажом, ён запатрабаваў у яе аддаць выручку. Прадавец не разгубілася і аказала рабаўніку супраціўленне. Той, сутыкнуўшыся з рашучым адпорам, палічыў за лепшае ўцячы з месца здарэння. Аднак аператыўная група Першамайскага РАУС Віцебска выйшла на след падазраваемага: ім аказаўся вучань 9 класа.

Ігар ГРЫШЫН.

Таленты нашага краю

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ СТАРОНКА

Іван ЛАПО

Мішка

АПАВЯДАННЕ

Памяці сябра прысвячаецца



Мішку я памятаю здаўна. З самага малку. І па сённяшні дзень захоўваецца дома фотаздымак, на якім ён, бы маленькі камячок, ціхутка прымасціўся на матчыных каленях. А побач з ёю — бацька з ягоным дзедам, бабуляй, і ўсёй астатняй іхняй вялікай матохінскай раднёй.

Ды і як можна забыць? Яшчэ хлапчукамі-свавольнікамі качаліся ўлетку па зялёнай травяной мурозе ля нашае старой хаты! Жылі ж па-суседску. Гулялі ў хованкі, сцізорык...

Добра ведаў і яго старэйшага брата Лёшку, які, відаць, першым і праклаў дарогу з далёкай поўначы на гістарычную радзіму сваіх продкаў. Тады ж я даведаўся, што маці іхняя развялася з бацькам па той простай прычыне, што быў ён дужа ахвочы да "зялёнага змія".

Як я пазнаёміўся з ім, Мішка часта таксама наязджаў... ў вёску ў госці да старых дзядулі і бабулі. Пасля прыехаў ужо больш сталым. Вы б толькі бачылі тады яго ўзбуджаны твар! Як гарэлі ягоныя вочы! Калі сусед няміласціва збіваў жалезінай нашага сабаку! А мы, маладыя ды зялёныя, нічога не маглі парабіць, супрацьстаяць жорсткасці. Бо ўсё адбылося так нечакана для нас абодвух. У лічаныя хвіліны.

* * *

У тое лета Мішка зноў завітаў у вёску. Для мяне гэта было бы сапраўднае свята! Як жа не радавацца? Гэта ж — мой сябра! Калі б я яго напаткаў дзе-небудзь у іншым месцы, то відаць і не прызнаў бы! Гэтак падрос! Так пасталеў!

Але, у нашай вёсцы, ды не пазнаць! Ён ужо крышачку стаў вышэй за мяне, вучыцца ў вучылішчы. І ўжо курыць. І быў ён ужо не тым былым ціхмяна-дапытлівым гарадскім хлапчуком, як дагэтуль.

І, трэба такому супасць! Якраз у той дзень да нас завіталі два дзядзькі-сваякі. І адкуль мне было ведаць, што адзін з іх быў яго, Мішкіным... бацькам.

Мішка яшчэ да іх прыходу да нас заходзіў. Казаў: — "Людзі добрыя перадавалі, што бацьку майго бачылі. Добра было б і самому яго пабачыць". І ў яго вачах, заўважыў, прамільгнула радасная надзея блізкай сустрэчы з родным чалавекам. Жылі ж адзін ад адного бацька і сын за многія сотні кіламетраў.

На той раз прадчуванне не падвяло яго. Мішка, як даведаўся з парогу, што вось ён, побач, ягоны бацька, сядзіць за сталом на падпітку ў нашай хаце, ціха-ціха сказаў мне:

— Праганю іх, злыдняў!

Але я папрасіў яго не рабіць гэтага. Няёмка ж неяк. Госці. І вось Мішка, які слаба ведаў свайго бацьку з далёкага дзяцінства, а больш па фотаздымкам, хіба што крыху ў твар, бо той пакінуў яго з маці ў трохгадовым узросце і крыху старэйшымі браціка з сястрычкай, працягнуў аднаму з дзядзькоў руку са словамі з расійскім акцэнтам:

— Здравствуй, отец!

Па тэлевізары дэманстравалі нейкі кінафільм і ўсе былі дужа захоплены ім. Тым больш, што і гарэлка дала знак. Ніхто так і не звярнуў на яго словы асаблівай увагі.

Маўчаў і Мішка, збянтэжаны такім нечаканым паваротам падзеі. Некалькі разоў ён, збіты з панталыку, то нервова-разгублена паходжваў па пакоі, то выходзіў у калідор, і ўсё шаптаўся там з маёю маці. Відаць, усё хацеў справодзіць дамоў нязваных гасцей.

Але раптам святло ў хаце пагасла. Тэлевізар — адключыўся. Ці-то Мішка пастараўся, ці-то лёсам так было наканавана. Мішка асмеліўся і, зноў падыйшоў, наблізіўся, ледзь выдавіў з сябе:

— Ты не пазнаеш мяне, бацька?

Бацька, магчыма, і сапраўды не пазнаваў яго. А можа, мне гэта так толькі падалося? Ці-то не хацеў прызнаваць? Пачаў нешта сваё мармычаць пад нос, расказваць свайму субяседніку. Бо быў жа пад хмелем.

— Отец, я твой сын! — зноў настойліва паўтарыў падлетак.

— Гэта ты, Мішка?.. — бацька вінавата, не верачы ў гэта, у выпадковую сустрэчу, усё лыпаў асалавелымі вачыма, гаворачы заплятаючымся языком.

* * *

...Пасля была размова. Дарослага сына і дарослага бацькі. Толькі, вось, было невядома, хто каго выхоўваў і павучаў. Я асабліва і не прыслухоўваўся да іх гаворкі. Да мяне толькі далятаді абрыўкі дакорлівых Мішкіных слоў:

— Ты нас пакінуў, пакінуў!..

У мяне на вачах, сам не ведаю ад чаго, нагартваліся слёзы. Мусіць, ад шкадавання сябра.

— А памятаеш, я табе поўную пасылку яблык прыслаў?.. —прыгадваў бацька.

— Не, не памятаю! — рэзка адказаў, бы адрэзаў, Мішка.

— Ды ты ж маленькі быў! — усё даводзіў той.

— Не, я ўсё памятаю, памятаю, памятаю... п'янага. Як і цяпер, —такім быў ягоны нечаканы адказ, як строгі і канчатковы прысуд.

Калі Мішка пайшоў да бабулінай хаты, а ён доўга ў нас не затрымаўся, відаць не вытрывалі нервы, п'яны бацька, які крыху ўжо працвярэзіўся, папытаў у свайго напарніка:

— Няўжо гэта быў ён, мой Мішка?

Той нічога не адказаў. Маўчаў і я. У галаве, як камяк у горле, застралі Мішкіны словы:

— Отец, я твой сын!

...Пасля таго выпадку, толькі ўжо праз некалькі гадкоў, ужо адслужыўшы тэрміновую, прыязджаў у вёску Мішка. Па старой звычцы ён зноў завярнуў да нас. З бутэлькай, чаму я даволі здзівіўся. Ведаючы, які ён піток. Але ўсё роўна быў рады сустрэчы.

Пра бацьку, як гэта было раней, ён больш ужо не пытаўся. Відаць, падрос, і ўсё зразумеў сам. Выпілі. Пасядзелі. Пагаварылі. Памаўчалі. Бы па нябожчыку. Развіталіся, як добрыя сябры. Няўжо, у апошні раз?

Цяпер Мішка жыве ў іншай краіне. Былой магутнай, якая распалася на шматлікія дзяржавы-аскалёпкі. Сёлета я выпадкова даведаўся, што ягоны бацька прапаў без вестак недзе там, у далёкім паўднёвым краі. Куды падаўся ў спадзеўцы на лаўчэйшае, цяплейшае і шчаслівейшае жыццё. Да сваіх заможных сваякоў.

Падальш у другі бок некалі вялікай краіны, ад родных дзяцей, якія нарадзіліся і жывуць зараз на поўначы расійскай. З'ехаў і знік, бы і не было яго на гэтым свеце. Як той першы асенні ліст, што адарваўся ад дрыжачай на ветрыку роднай галінцы і ўпаў на зямлю. І тым самым пазбавіўся сваіх каранёў, што з вясны да восені давалі яму моц і сілу.

1994 г.

* * *

...А сёлета страшная вестка дайшла да мяне. Не стала на гэтым свеце і самога Мішкі. Падлюгі забілі яго і спалілі ў качагарцы. Ён быў даверлівым хлопцам. Можа гэта абставіны і загубіла яго? Якім кароткім, іншы раз, бывае чалавечае жыццё!

1999 г.

Василий ДОЛГОЛЕВ

КОЛДОВСКАЯ ЛЮБОВЬ

ПОВЕСТЬ

(Продолжение. Начало в NN 10-11, 13-14, 21-24)

— Да, Агнесса Петровна. Врать не к лицу. Я догадывался, что симпатичен тебе. Но чтобы ты могла так сильно меня любить — и в голову не приходило. Признаюсь — я равнодушен был к тебе. Я никогда так близко тебя не видел. А сегодня меня поразила вначале твоя нежная грудь, которую я увидел у тебя из-под блузки, когда ты на коленках собирала ягоды, а затем все твое тело, когда ты прижалась, такое приятное и горячее. Как женщина, ты мне понравилась. Ты, ну, как тебе попроще сказать... очень вкусная.

— Спасибо за комплимент...

— Нет, это не комплимент. Просто, я не могу подобрать лучшего слова для выражения чувств...

— Так все-таки понравилась?

— Да.

— Спасибо.

Лес кончился и по обе стороны дороги стеной встала густая рожь. В лесу было тихо, а тут ветер волновал ржаное поле, будто море.

— Хороши нынче хлеба, — сказал Масолов. — Надо не прозевать с ремонтом комбайнов. Вовремя убрать — уже избежать больших потерь. А если еще оборудовать жатки различными приспособлениями, то и вовсе на нет свести их можно.

— Агрономическая служба свое дело сделала. Теперь посмотрим, как справится с задачами инженерная.

— Не подкачаем, Петровна!

— Николай! Давайка мы с этого момента друг друга по имени называть. И поласковей. Когда одни, конечно. Чтоб никто не догадался о нашей близости.

— Ну что ж. Я согласен. Но как будем строить наши отношения дальше?

— Для общества — по-прежнему. Для нас двоих — как нам пожелается. Я не многого прошу. Приходи ко мне только, когда тебе очень этого захочется.

— Как приходи? Куда приходи?

— Очень просто. Куда захочешь. Скажешь, чтобы я ожидала тебя на краю света — я побегу туда и буду ждать тебя там хоть вечность. Скажешь среди ночи ждать возле нашей кочки — буду сидеть и ждать. Я раба твоя, приказывай. Требуй. Все выполню. Но об одном прошу: не откажись от меня. Масолов не отказался. Не в силах бы отказаться.

Летом встречи у них были довольно частыми. Все больше в поездках по колхозам. Он старался чаще выезжать так, что с ними не бывало попутчиков. Они заворачивали в укромное местечко, где не мог их никто увидеть, и предавались любви.

Агнесса была божественно нежна и ласкова. Мила и добра. Он обожал ее. Но продолжал еще любить Тамару. С ней связывала его и пятилетняя дочурка. Но места для жены в душе Николая оставалось все меньше и меньше, так как она была к нему холодна и такой радости, как с Агнессой, с ней он не испытывал.

Но вот пришла осень. Затяжные дожди и холод не давали возможности встретиться Николоаю с Агнессой в нелюдных местах. Он мог бы закрыться с ней в своем рабочем кабинете, но боялся, что кто-нибудь случайно раскроет их тайну. Весь октябрь они так и не смогли ни разу разделить свою любовь. Но судьбе было угодно посодействовать им. Начальник управления попросил Масолова подежурить в своем кабинете до 12 часов ночи, а с 12 его сменит Лискина.

Лискина пришла, как только стемнело. В управлении не было ни души и у них на любовь было целых четыре часа. Агнесса принесла бутылку шампанского и две сотки коньяку, отличную закуску: заливную стерлядку, кетовую икру, яйца в смятку, пирожное, шоколад и черный кофе.

Это был вечер колдовской любви. Три раза кто-то звонил, но они и не подумали снять телефонную трубку. Они даже забыли, что кто-то может придти, постучаться к ним в дверь, коль молчит телефон. Такого, правда, не случилось. Судьба им подыгрывала. Они отдавались друг другу безудержно, будто стараясь наверстать упущенное и взять от любви в аванс.

Потом был снова большой перерыв, пока однажды Николай и Агнесса не решились отдать дань любви в обеденный перерыв прямо в кабинете, когда в управлении никого не было. Потом они время от времени повторяли этот вариант. А иногда задерживались после работы.

Как-то бабушка Фрося, мать Тамары, забрала внучку Лену к себе в гости "на недельку-другую". Николай с Тамарой остались вдвоем. И Тамара почти перестала дома готовить. Готовила только завтрак да иногда ужин. Поживем, говорит, немного свободней, пока Лена у мамы. А пообедать ты можешь в столовой. А я и буфетом перебьюсь.

Николай даже обрадовался такому. Теперь не нужно будет искать отговорок, почему на обед не приходил. Рассказал об этом и Агнессе. И стали они в обеденный перерыв закрываться в его кабинете почти ежедневно.



Так было и в тот день, когда Тамара получила письмо от Вадима. В обед Николай был с Агнессой и пришел вечером с работы в приподнятом настроении.

Увидев жену в артистической позе, он залюбовался ею. Она и впрямь была прекрасна. А грудь была богаче, чем у Агнессы. И длинные пышные волосы давали выигрыш против красивой, но короткой прически любовницы. И вот состоялся еще один вечер колдовской любви у Николая. На этот раз с женой. Не было шампанского, не было коньяка. Усталые, разомлевшие от такой горячей любви, они даже не ужинали. Выпили в полночь по чашке холодного какао со сдобной булкой и легли, обнявшись, спать. А назавтра все изменилось. Тамара стала необыкновенно любить мужа. И чем дальше, тем еще сильнее. И любовь эта была не краденая. От нее перед людьми не нужно было таиться.

К Николаю возвращались прежние чувства. В душе его с каждым днем прибавлялось место для Тамары. Чашка душевных весов, предназначенная для Агнессы вскоре поднялась уже выше той, что была для жены. С женой он был близок теперь всегда. С Агнессой — редко. Теперь жена давала Николаю радости неизмеримо больше, чем любовница.

Прошло полтора месяца, как Николай уже совсем не был наедине с Агнессой. Старался вообще избегать встреч с ней. Но она все же улучила момент и шепнула ему в коридоре:

— Милый, останься сегодня в обеденный перерыв. Умоляю...

— Хорошо, но не стой, а то кто-нибудь заметит.

— Спасибо! — прошептала она и быстро отошла.

Когда все сотрудники ушли на обед, Агнесса вошла в его кабинет и повернула ключ.

(Продолжение следует)

Фелікс ШКІРМАНКОЎ

У КАНЦЫ ТЫСЯЧАГОДДЗЯ

У канцы тысячагоддзя,
Што ні дзень, то новы жах.
А дваццатае стагодзе
Цісне так, што "едзе дах".

Землятрусы, спёка паліць,
Дзе заліла ўсё вада.
Машкара скаціну валіць,
За бядой ідзе бяда.

"Цуды" робяцца ў Дзяржаве.
Не Расія, не Чачня,
Але тое, што на справе,
Гэта, людцы, не гульня.

Не гульня, калі знікае
Усім вядомы чалавек,
А улады не кранае,
Быццам знік злачынца-"зэк".

Забаронены "Навіны".
Хто наступны у чарзе?
Тэлебачанне краіны
Па-зімоўскаму вярэе.

...У канцы тысячагоддзя,
Што ні дзень, то новы жах.
А у нашым асяроддзі.
Ад улады "едзе дах".

Алесь САКАЛОЎ

ЧАРАЎНІЦА

Я да цябе сцяжынкай вузкай
Бег на спатканне нездарма,
Бо твае вочы, твае вусны
Чароўныя, як ты сама.

Ах, чараўніца, чараўніца,
Блакітны ласкавы пагляд,
Цяпер начамі мне не спіцца
Шукаю ў небе зарапад.

Ідуць дзяўчаты па суніцы,
На рэчцы дрэмлюць рыбакі,
Нясу табе я, чараўніца,
З замілаваннем васількі.

Ах, чараўніца, чараўніца,
Не утрымаць гэты букет,
Звініць вясёлая сініца
І дастае з вулля мёд дзед.

Якая слодыч тваіх вуснаў!
Яны смачнейшыя за мёд.
Я да цябе сцяжынкай вузкай
Бягу у непаўторны год.

Ах, чараўніца, чараўніца,
Я без цябе жыць не магу,
Бруіцца чыстая крыніца,
Зязюльчын спеў нясе тугу.

Ах, чараўніца, чараўніца,
Дагэтуль мне не верыцца,
Як грукатала навальніца,
Як плакала мяцеліца.

Ах, чараўніца, чараўніца,
Блакітны ласкавы пагляд,
Я ад жыцця паспеў стаміцца
І не вернуць гады назад.
Не адшукаў свой зарапад...

Программа телевидения

ПОНЕДЕЛЬНИК, 14 февраля

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.00 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 "Сегодня с вами..."
9.50 Здоровье.
10.15 "Ты окликни меня, позови..." Поэтическая новелла по стихам Е.Янищиц.
10.30 "Все дело в шляпе".
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 Теленавигатор.
12.15 Короткометражный худ.фильм "Медведь".
13.15 "Формула любви". Худ.фильм.
14.40 "Я встречу, я узнаю..." Док.фильм.
15.15 "Муми-тролль и другие". Мультфильм.
15.35 Видеокурс немецкого языка.
16.05 ТВ — школе.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.15 Бездельник.
17.40 Туробъектив.
18.00 "Поцелуй". Концертная программа к дню Св.Валентина.
18.25 "Понедельник с "Христофором".
18.40 Спортивные новости.
19.20 Политические диалоги.
19.50 "Кофе с ароматом женщины".
20.30 "Ася". Фильм по биографическим заметкам М.Цветаевой.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 КВН. Кубок Беларуси.
23.25 Криминальная хроника.
23.30 Третий тайм.

ОРТ

13.30 Программа "Вместе".
14.00, 17.00, 23.20 Новости.
14.20 "Охотники за привидениями".
14.40 Что да как.
15.00 Звездный час.
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 "С легким паром!"
17.55 Мы и время.
18.45 Погода.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Сериал "Секретные материалы".
22.40 Взгляд.
23.35 "Майк Хаммер. Мертвый голубок".

"РОССИЯ"

8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Квантовая медицина.
9.10 "Цыганка".
9.55 "Крутые двойники". Худ. фильм (Индия). 1-я серия.
11.00 Москва — Минск.
15.30 "Черный Пират". Мультсериал (Италия).
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
[illegible] туман.
20.45 [illegible] Д.Джейсон Ли в мелодраме "Любовное письмо" (США).
22.40 "Спорт + ТВ". Тележурнал.
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".

НТВ

5.00, 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Она написала убийство".
8.50 Мультфильм "Однажды утром".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 "Сегодня".
9.25 "Вчера в итогах".
10.45 "Куклы".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает. "Три ненастных дня".
13.35 "Чистосердечное признание".
14.00 "Улицы разбитых фонарей-II". "Королева красоты".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 "Впрок".
16.40 "Интересное кино".
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 "Криминал".
18.40 "Герой дня".
19.00 "Скорая помощь".
19.55 "Совершенно секретно".
21.45 "Двое".
22.30 "Сегоднячко".
23.10 "Сегодня в полночь".
23.30 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.30 "И огонь, и пламя". Телесериал.
11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 "Реквием". Скульптор В.Сидур.
12.15, 13.45, 15.10 Шедевры мирового музыкального театра. Р.Вагнер. Опера "Летучий голландец".
14.45 "Дар художника". А.Стеффанони.
15.00 Новости.
15.45 "Террор". Док. фильм.
16.35 "И огонь, и пламя". Телесериал.

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.15 Пунктир.
13.55 Телелоцман.
14.15 "Скарбы". "Беларускі ручнік".
14.35 Мультфильмы.

"МОГИЛЕВ-1"

6.30, 7.10 "Ранехонько!".
7.00 Астро-дайджест.
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.50 "Очевидец". Док. сериал.
9.20 "Поли". Приключения.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильм.
17.30 "Путешественники во времени". Док. сериал.
18.00 "Праздник в Вашем доме".
19.00 Тяжелый день.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Не было печали". Худ.фильм.
21.55 Астро-дайджест.
22.05 "Любовная история". Мелодрама.

ВТОРНИК, 15 февраля

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.05 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Мультфильм.
10.10 "На волне взаимопонимания".
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
11.55 Третий тайм.
12.30 "Сержант". Короткометражный худ.фильм.
13.10 "Песню берите с собой". Финальный гала-концерт. Часть 1-я.
15.15 Мультфильм.
15.35 Видеокурс итальянского языка.
16.05 Видеокурс английского языка.
16.30 ТВ — школе.
17.15 "А музыка звучит..."
17.35 "Нарисуйте мне дом". Телеочерк о судьбе инвалида Алексея Талая (г.Орша).
17.50 Слово Митрополита Филарета в день Сретения Господня.
18.05 "АРТ-клуб".
18.40 Спортивные новости.
19.20 "Сегодня с вами..."
19.55 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Иронический детектив "Ловушка для одинокого мужчины".
23.30 Криминальная хроника.
23.35 Музыка без границ.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.00 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Джентльмен-шоу.
9.45 И.Купченко в авторской программе "Бабье лето".
10.20 Вкусные истории.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.45 Возможно все!
15.00 Юные гладиаторы в программе "Царь горы".
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 Смехопанорама.
17.55 Ищу тебя.
18.45 Погода.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Комедия "Живите в радости".
22.25 Тихон Хренников в программе "Жизнь замечательных людей".

"РОССИЯ"

15.30 "Черный Пират".
16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
16.20 "Башня".
17.05 "Жара в Лос-Анджелесе - II".
18.30 "Петербургские тайны".
19.25 Полный модерн.
20.45 Кинокомедия "Бабник".
22.05 Кинокомедия "Мужчины и женщины".
22.45 "К-2" представляет: музыка и любовь Микаэла Таривердиева в "Колизее".
23.45 Телеспецназ: "Дежурная часть".

НТВ

5.00 5.30, 5.45, 6.00, 6.30, 6.45, 7.00, 7.30 "Сегодня утром".
7.55 "Совершенно секретно".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 "Сегодня".
9.25 "Итого".
9.45 "Один день". Программа К.Набутова.
10.15 "Путешествие натуралиста".
10.45 Мультфильм.
11.30 "Старый телевизор" вспоминает: "Три ненастных дня". Заключительная с.
13.30 М.Зудина и С.Любшин в фильме "Забавы молодых".
15.35 "Лоис и Кларк. Новые приключения супермена".
16.25 "Впрок".
16.40 "Интересное кино".
16.50 "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 "Криминал".
18.35 "Герой дня".
18.50 "Скорая помощь".
19.40 "Глас народа" представляет . "Афганский капкан-2". Фильм Е.Киселева из цикла "Новейшая история".
21.45 "Глас народа".
23.00 "Сегоднячко".
23.40 "Сегодня в полночь".
0.00 "Антропология".

"КУЛЬТУРА"

10.30 "И огонь, и пламя".
11.30, 13.30 Новости культуры.
11.40 "Балканский экспресс". Худ. фильм.
13.20 Поклонникам Терпсихоры.
13.45 Мультфильмы.
14.15 Рассказы старого сплетника. "Анатолий Эфрос на телеэкране".
14.40 "Московские пенаты". П.В.Нащокин.
15.00 Новости.
15.10 "Жил-был хомяк".
15.35 Времена и воины. "Нормандцы".
16.05 Ортодокс.
16.35 "И огонь, и пламя".

"МОГИЛЕВ-1"

6.30, 7.10 "Ранехонько!".
7.00 "Навіны раніцы".
8.05 "Искушение". Телесериал.
8.50 "Очевидец". Док. сериал.
9.20 "Не было печали". Худ. фильм.
16.30 "Диагноз:убийство". Телесериал.
17.20 Мультфильмы.
17.40 "Выйти из боя". К 11-летию вывода советских войск из Афганистана.
17.55 "Праздник в Вашем доме".
18.30 Катастрофы.
19.00 Бобруйский вариант.
19.20 Телемагазин.
19.30 День области.
20.00 "Праздник в Вашем доме".
20.45 "Жизнь в забвении". Комедия.
22.15 Астро-дайджест.
22.25 "Ответный ход". Худ. фильм.

СРЕДА, 16 февраля

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.40 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "Антология белорусской поэзии".
8.10 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.35 Видеокурс итальянского языка.
10.05 Мультфильмы.
10.25 Телевизионный Дом кино. Художник кино и театра Владимир Чернышов.
11.15 "Кофе с ароматом женщины".
12.00 Компьютерный полигон.
12.25 Зорная ростань.
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь" с участием 1-й белорусской антарктической экспедиции.
15.15 Мультфильм.
15.35 Видеокурс немецкого языка.
16.05 "5 х 5".
16.35 "Колесо". Короткометражный худ.фильм.
17.10 Документальный экран. "Музы Слонима".
17.30 "Макаенка,9".
18.00 Первый съезд Союза белорусской песни. Концерт. Часть 1-я.
18.40 Спортивные новости.
19.15 "Сегодня с вами..."
19.40 Лотерея "Толока".
19.55 "Кофе с ароматом женщины".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Б.Брондуков в худ.фильме "Дело для настоящих мужчин".
23.05 Криминальная хроника.
23.10 Королевская охота.
23.50 Хоккей. Чемпионат ВЕХЛ. ХК "Минск" — "Тивали" (Минск). 3-й период.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 0.05 Новости.
8.15 "Нежный яд".
9.15 Смехопанорама.
9.45 Ищу тебя.
10.30 "Новые приключения Синдбада".
13.30 Программа "Вместе".
14.20 "Охотники за привидениями".
14.45 Классная компания.
15.00 Зов джунглей.
15.25 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Нежный яд".
17.25 Маски-шоу.
17.55 Человек и закон.
18.45 Погода.
18.50 "Девушки с характером".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Д.Богард, Ш.Коннери, Р.Редфорд, Л.Оливье в фильме "Мост слишком далеко".

"РОССИЯ"

6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 18.00, 20.00, 0.00 Вести.
7.15 Телеспецназ: "Дежурная часть".
8.20 Квантовая медицина.
8.30 "Арена — спорт".
9.00 Квантовая медицина.
9.10 "Цыганка".
9.55 "Крутые двойники". Худ. фильм (Индия). 2-я серия.
15.30 "Черный Пират".
16.20 "Башня".
